***Аляксандр Карацееў***

## НАРОДНЫЯ ДУХАВЫЯ ІНСТРУМЕНТЫ БЕЛАРУСАЎ: ДА ПРАБЛЕМЫ ПАДРЫХТОЎКІ ПРАФЕСІЙНЫХ КАДРАЎ ВЫШЭЙШАЙ КВАЛІФІКАЦЫІ (ў кантэксце духавога мастацтва Беларусі і музычнай педагогікі)

Вывучэнне працэсу падрыхтоўкі кадраў у той ці іншай галіне прафесійнай дзейнасці чалавека заўсёды абумоўлена пошукам такіх галоўных пытанняў, як: 1) роля той ці іншай спецыяльнасці і адпаведнай ёй кваліфікацыі ў жыцці грамадства, яе сацыяльны, эканамічны ці сацыякультурны прэстыж; 2) вызначэнне мэты падрыхтоўкі спецыялістаў у адпаведнасці з сацыяльным патрабаваннем, патрабаваннем часу ці патрабаваннем рынасных умоў; 3) вызначэнне аптымальнага зместу працэсу падрыхтоўкі спецыялістаў; 4)вызначэнне пераліку аптымальных ведаў, навыкаў і уменнях будучых спецыялістаў у адпаведнасці са ўзроўнем іх падрыхтоўкі (сярэдняя ці вышэйшая кваліфікацыя).

Сярод розных спецыяльнасцей у галіне нацыянальная культуры найбольш праблематычна, на наш погляд, складаецца сітуацыя з забеспячэннем творчых мастацкіх калектываў і навучальных устаноў Беларусі выпускнікамі вышэйшай кваліфікацыі па спецыяльнасці 1-16 01 06 – «Духавыя інструменты (па напрамках)» напрамку спецыяльнасці 1-16 01 06 11 – «Духавыя інструменты (народныя)» (мы не разглядаем такое актуальнае пытанне і асобную праблему, як безумоўная неабходнасць фарміравання сістэмы падрыхтоўкі гэтых кадраў у пачатковых і сярэднеспецыяльных установах культуры і мастацтваў рэспублікі). Таму важны этап і адказны момант працэсу падрыхтоўкі будучых спецыялістаў нацыянальнай культуры – гэта адбор і падрыхтоўка абітурыентаў для навучання па гэтай спецыяльнасці [8, с. 81 – 84].

Агляд спецыяльнай літаратуры дазваляе вызначыць, что працэс падрыхтоўкі выканаўцаў на традыцыйных народных духавых музычных інструментах беларусаў у кантэксце духавога мастацтва Беларусі – вельмі складаная з’ява [4, с.138 – 146], якая характарызуецца цэлым шэрагам праблем і актуальных пытанняў [5, с. 375 – 377; 6, с.18 – 21; 7, с. 165 – 166]. Гэтыя праблемы павінны вырашаць спецыялісты-практыкі, якія маюць дастатковы вопыт у сваёй працы. Адзначым, что падрыхтоўка выканаўцаў на народных духавых інструментах з кваліфікацыяй «саліст-выканаўца», «артыст ансамбля», «артыст аркестра», «выкладчык» ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў мэтанакіравана ажыццяўляецца з 2000 года. Безумоўна, з мэтай вучэбна-метадычнага забяспечэння гэтага працэсу неабходна было падрыхтаваць адпаведныя выданні, як, напрыклад, гэта мае месца ў Расіі [1]. Адзначым, што такія выданні, у тым ліку і тыпавыя вучэбныя праграмы, на працягу ўсяго перыяду падрыхтоўкі разглядаемых намі спецыялістаў былі надрукаваны, а сярод найбольш фундаментальных з іх з’яўляецца «Школа ігры на беларускіх народных духавых інструментах» у дзвух частках [2; 3]. Безумоўна, дысцыпліна «Спецыяльныя народныя духавыя інструменты» у працэсе падрыхтоўкі будучых спецыялістаў народна-інструментальнага выканальніцтва на духавых інструментах і адпаведнай педагагічнай дзейнасці з’яўляецца вызначальнай. Менавіта яна спрыяе фарміраванню прафесійных навыкаў студэнтаў, усебаковаму развіццю іх творчай індывідуальнасці, выхаванню на лепшых узорах фальклорнай, народнай класічнай

і сучаснай музыкі, самастойнасці мастацка-вобразнага мыслення. Засваенне студэнтамі сутнасці выканальніцкага майстэрства на народных духавых інструментах прадугледжвае параўнальны аналіз і сувязь з рознымі дысцыплінамі спецыялізацыі: 1)музычна-тэарэтычныя дысцыпліны (сальфеджыо і тэорыя музыкі); 2)агульна-прафесійныя дысцыпліны (народна-інструментальная музычная культура Беларусі; сусветная і нацыянальная этнаарганалогія; нацыянальная і сусветная гісторыя выканаўства на народных духавых інструментах; методыка работы з фальклорным калектывам); 3)творча-практычныя дысцыпліны (народна-аркестравае выканальніцтва; народна-ансамблевае выканальніцтва; інтэрпрытацыя народнай музыкі; рэстаўрацыя і выраб беларускіх народных інструментаў і інш.).

Вывучэнне разглядаемай намі праблемы дазволіла вызначыць галоўную мэту дысцыпліны «Спецыяльныя народныя духавыя інструменты» – падрыхтоўка прафесійных выканаўцаў на народных духавых музычных інструментах (свістковыя, язычковыя, амбушурныя) і ўдарных інструментах, якія здольны займацца самастойнай творча-выканальніцай дзейнасцю як канцэртны выканаўца, як артыст ансамбля ці аркестра і як выкладчык, якія будуць забяспечыць навучальны працэс па падрыхтоўцы адпаведных выканаўцаў у пачатковых, сярэднеспецыяльных і вышэйшых установах культуры і мастацтваў, а таксама выканаўцаў у сферы аматарскай творчасці.

Асноўнымі задачамі дысцыпліны «Спецыяльныя народныя духавыя інструменты», на наш погляд, павінны стаць наступныя задачы: 1)атрыманне грунтоўных ведаў у народна-інструментальным кірунку музычнага мастацтва; 2)развіццё адпаведных творча-выканальніцкіх навыкаў і здольнасць у будучай асабістай мастацка-прафесійнай дзейнасці працягваць працэс захавання і развіцця народных традыцый; 3)уменне састаўляць планы самастойнай работы над інструктыўным матэрыялам (практыкаванні, гамы, эцюды, творы); 4)самастойнае вызначэнне ансамблевых ці аркестравых цяжкасцей і ажыццяўленне адпаведнай работы па іх дакладным выкананні; 5)дакладнае ажыццяўленне настройкі таго ці іншага музычнага інструмента з дапамогай цюнара ці фартэпіяна; 6)ажыццяўленне неардынарных творчых эксперыментаў і пошукі найбольш эфектыйных канцэртных увасабленняў народнай традыцыйнай музыкі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і сучасных аўтарскіх творах народна-інструментальнага мастацтва; 7)спрыянне сацыякультурнаму прэстыжу народна-інструметальнай спадчыны Беларусі.

За перыяд навучання ва ўніверсітэте па дысцыпліне «Спецыяльныя народныя духавыя інструменты» студэнты павінны атрымаць тыя грунтоўныя веды, якія цалкам забяспечаць іх прафесійную выканальніцкую і вучэбна-педагагічную падрыхтоўку на свістковых, язычковых і амбушурных беларускіх народных духавых і беларускіх ударных інструментах. Сярод такіх ведаў, у першую чаргу неабходна адзначыць наступныя: 1)класіфікацыя, функцыянальныя і мастацка-выканальніцкія асаблівасці асноўных беларускіх народных духавых інструментаў (тыпалогія; выразна-тэхнічныя магчымасці; строй; дыяпазон, натацыя і г.д.); 2)сутнасць сольнага выканаўства (*solo*; *solo* ў суправаджэнні фартэпіяна; *solo* ў суправаджэнні інструментальнага ансамбля ці капэлы беларускіх народных духавых інструментаў); 3)псіхолага-педагагічныя і арганізацыйна-метадычныя асаблівасці арганізацыі работы па засваенні беларускіх народных духавых інструментаў (выкарыстанне неабходных дыдактычных прынцыпаў у працэсе заняткаў на музычным інструменте; вызначэнне асноўных кірункаў заняткаў, іх змест і адпаведны аб'ём заданняў; выкарыстанне неабходных тэхнічных сродкаў і г.д.); 4)паслядоўнасць этапаў работы над музычнымі творамі (музычна-выканальніцкі аналіз вывучаемых твораў; адпаведны графік вывучэння найбольш складаных фрагментаў выконваемых твораў; асноўные этапы, паслядоўнасць работы над асабістым творам ці іх камбінацыямі); 5)выкананне варыянтаў, трактовак, інтэрпрытацый, рэдакцый, музычных твораў (параўнальны аналіз музычнага матэрыяла); 6)функцыянальныя мастацка-выразныя магчымасці свістковых, язычковых і амбушурных беларускіх народных духавых інструментаў (solo, кантрапункт, музычная арнаментыка і г.д.); 7)сацыякультурныя аспекты і асаблівасці арганізацыі канцэртна-выканальніцкай дзейнасці выканаўцаў на беларускіх народных духавых і ўдарных інструментах (трансліраванне лепшых узораў музычнай спадчыны; удзел у святах, фестывалях, канцэртах беларускага нацыянальнага мастацтва; сцэнічная культура выканаўцы і скасаванне такіх негатыўных з'яў, як сцэнічнае хваляванне, эмацыянальная статычнасць і г.д.).

Неабходна дадаць, што працэс навучання па дысцыпліне «Спецыяльныя народныя духавыя інструменты» павінен ажыццяўляцца з улікам засваення будучымі спецыялістамі вышэйшай кваліфікацыіі асноўных народных духавых беларускіх духавых інструментаў і фарміраваннем, а таксама ўдасканальваннем у такіх спецыялістаў наступных уменняў: 1)авалоданне асноўнымі элементамі выканальніцкага майстэрства як на базавым інструменце, так і асаблівасцямі выканальніцкіх навыкаў на дадатковых традыцыйных інструментах, уключаючы арганізацыю папярэдняй ранішняй размінкі з мэтай актывізацыі і падрыхтоўкі выканальніцкага апарату (работа над выканальніцкім дыханнем без інструмента, апертура і амбушур, дыяфрагма, асноўная і дадатковая аплікатура); 2)выкананне вызначаных абавязковых ранішніх практыкаванняў на аснове кантрастнага супастаўлення (кантылена і складаныя тэхнічныя камбінацыі). Вырашэнне праблем гукаутварэння, звязаных са спецыфікай кожнага з традыцыйных народных духавых інструментаў. Папярэдняя падрыхтоўка выканальніцкага апарату да аўдыторных заняткаў з выкладчыкам і канцэртмайстрам. Дакладнае выкананне абертонаў; 3)карэктура інтанавання ў працэсе ігры з канцэртмайстрам; 4)збалансаванне дынаміка-акустычнага гучання ў працэсе сумеснага выканання твора ў суправаджэнні фартэпіяна; 5)тэхналогія выканання штрыхоў, прыёмаў і манеры гучання ў залежнасці ад жанравай накіраванасці твораў. Супастаўленне розных штрыхавых камбінацый з мэтай іх дакладнага выканання ці кантрастнага эфекта; 6)дакладнае выкананне метра-рытмічнай структуры (інструктыўны матэрыял, вучэбна-педагагічны ці канцэртны рэпертуар); 7)вызначэнне спецыфікі пабудовы і выканання фразіроўкі, а таксама матываў, кантрапункту рэчытатыву; 8)расшыфроўка і выкананне музычнай арнаментыкі (трэлі, групета, мардэнт і г.д.); 9)выкананне незнаёмых музычных твораў рознай ступені складанасці і формаў у працэсе чытання нот з ліста.

Неабходна дадаць, што падчас навучання па дысцыпліне «Спецыяльныя народныя духавыя інструменты» будучыя спецыялісты народна-інструментальнага і духавога мастацтва павінны прафесійна авалодаць базавым інструментам – храматычнай дудкай – сапрана in C, а таксама абавязкова і шэрагам дадатковых духавых інструментаў у наступных групах: 1)свістковыя (разнастайнасці дудак: сапрана in C, альт in G, тэнар in F, бас in C, паршнёвая дудка, парныя дудкі; акарына); 2)язычковыя (жалейка дыятанічная і храматычная; дуда in D, in G; саломка); 3)амбушурныя (драўляная труба).

Акрамя гэтага, студэнты падчас заняткаў па дысцыпліне «Спецыяльныя народныя духавыя інструменты» павінны азнаёміцца і з такімі традыцыйнымі духавымі народнымі інструментамі беларусаў, як чаротка, рог, свісцёлкі, дудкі з натуральнымі страямі і г.д., а таксама і з ударнымі народнымі інструментамі беларусаў. Безумоўна, працэс авалодання абавязковымі інструментамі павінен ажыццяўляцца па дыдактычным прынцыпе ад прастога да складанага, і адпаведна, паэтапна размяркоўвацца ў лагічнай паслядоўнасці: дудка сапрана in C; акарына in C (in G); жалейка in G (in D); дуда in D (in G); парныя дудкі, саломка; паршнёвая дудка, драўляная труба (азнакамленне); азнакамленне з іншымі традыцыйнымі духавымі народнымі музычнымі інструментамі беларусаў.

**Такім чынам,** дысцыпліна «Спецыяльныя народныя духавыя інструменты» спрыяе прафесійнаму станаўленню пакуль дэфіцытных выканаўцаў вышэйшай кваліфікацыі на традыцыйных народных духавых інструментах беларусаў, якія атрымліваюць якасную падрыхтоўку у сваёй Alma mater і пасля заканчэння навучальнай установы здольны плённа працаваць у розных прафесійных мастацкіх калектывах (ансамблі,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

аркестры) у якасці салістаў-выканаўцаў, артыстаў, а таксама ў якасці выкладчыкаў, якія здольны вырашаць складаныя псіхолага-педагагічныя задачы па развіццю творчых навыкаў навучэнцаў у працэсе засваення імі асаблівасцей выканальніцкага мастацтва ігры на самабытных, ўнікальных традыцыйных розных беларускіх народных духавых інструментах.

**Спіс літаратуры:**


1. Буданков, О.А. Практический курс игры на русских народных духовых и ударных инструментах / О.А. Буданков, М.Б. Вахутинский, В.К. Петров. – М. : Музыка, 1991. – 192 с., нот.
2. Гром, У.М, Крамко, А.Я., Мангушаў, І.А. Школа ігры на беларускіх народных духавых інструментах / У.М. Гром, А.Я. Крамко, И.А. Мангушаў : вучэб.-метад. дапам. – Мінск : Бел. дзяр. ун-т культуры і мастацтваў, 2005. – Ч. 1. Сольнае выкананне. – 259 с.
3. Гром, У.М., Крамко, А.Я., Мангушаў, І.А. Школа ігры на беларускіх народных духавых інструментах / У.М. Гром, А.Я. Крамко, И.А. Мангушаў : вучэб.-метад. дапам. – Мінск : Бел. дзяр. ун-т культуры і мастацтваў, 2005. – Ч. 2. Ансамблевае выкананне. – 217 с.
4. Коротеев, А.Л. Генезис образования специалистов духового исполнительского искусства Беларуси (народно-инструментального, профессионального и любительского) / А.Л. Коротеев // Музыкальное искусство и музыкальное образование на рубеже веков : матер. научных конференций «Беларусь и музыкальное наследие XX столетия: поиски и обретения» (29-30 ноября 2001 г., Минск), «Музыкальное образование в контексте художественной культуры» (10-11 декабря 2002 г., Минск). – Вып. 1. – Минск : Белорус. гос. акад. музыки, 2004. – С. 138-146.
5. Коротеев, А.Л. Дисбаланс квалификационно-педагогических компонентов системы подготовки специалистов профессионального и любительского духового искусства Беларуси / А.Л. Коротеев // Проблемы развития педагогического образования : матер. междунар. науч.-практ. конф., Минск, 17 дек. 2004 г. / Бел. гос. пед. ун-т им. М. Танка ; редкол.: К.В. Гавриловец [и др.] ; отв. ред. А.В. Торхов, З.С. Курбыко. – Минск : БГПУ, 2005. – С. 375-377.
6. Коротеев, А.Л. Использование функционально-ролевых игр в процессе подготовки специалистов духового искусства высшей квалификации Беларуси (народные и оркестровые духовые, ударные инструменты) / А.Л. Коротеев // Игровые технологии в современном воспитательном процессе: матер. респ. науч.-практ. конф., 12-13 февр. 2004 г., Мозырь : В 3 ч. Ч. 1. – Мозырь: УО МГПУ, 2004. – С. 18-21.
7. Коротеев, А.Л. Мотивационные и аттестационно-квалификационные аспекты вузовской системы подготовки исполнителей на белорусских народных духовых музыкальных инструментах / А.Л. Коротеев // Высшая школа : проблемы и перспективы : матер.VI междунар. науч.-метод. конф., Минск, 23-24 ноября 2004 г. – Минск : РИВШ, 2004. – С. 165-166.
8. Карацееў, А.Л. Спецыяльнасць «Духавыя інструменты (народныя)» / А.Л. Карацееў // Крытэрыі ацэнкі ведаў абітурыентаў на ўступных экзаменах : метад. указанні / пад агульн. рэд. А.І. Смоліка. – Мінск : Бел. дзярж. ун-т культуры, 2003. – С. 81-84.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ